**Мішчанчук М.І. (Брэст)**

## Паэзія Максіма Танка: рух да жанравай свабоды

Максім Танк – эксперыментатар у галіне жанраў. Ён, асабліва ў апошніх зборніках, адвольна імі карыстаўся, адчуваючы ў эпоху жанравай маладосці слоўнага мастацтва неабходнасць узаемапераходнасці, спалучальнасці розных прыкмет, пераадольвання бар’ераў нарматыўнасці. Жанравая і міжжанрававая мадыфікацыя выявілася ў яго паэзіі яшчэ і таму, што тая амаль з самага пачатку была скіравана (зарыентавана) на міжродавую дыфузійнасць.

Пагартаем старонкі апошняга прыжыццёвага зборніка “Errata”. З філасофскай лацінскай назвай – творы ж пра вечнае, неўміручае! Ужо першы твор з такой самай назвай – роздум, развага, самаацэнка, пра падвядзенне вынікаў зямнога жыцця з выйсцем на жыццё ў вялікім (паводле М. Бахціна) часе. Так, урэшце, пра тую спадчыну, якую не сорам пакінуць нашчадкам. Поўную, без купюраў. “выкрасленых / Некалі цэнзурай” [2, с. 268], дат, падзей, імён, “спаленых / Агнём выратавальным” [2, с. 268]. Сумленную і шчырую. Адноўленую цаной неймаверных высілкаў. Спавядальным маналогам зборнік адкрываецца: самым лірычным жанрам, прасякнутым спавядальным пафасам.

Далей чытаем эпіграму – балючую іронію з філасофскім падтэкстам, непадлеглай, на першы погляд, выпадку лацінскай назвай “Memento mori”. Але гэта толькі на першы погляд: у вершы – сатыры, іроніі, гумарэсцы (усяго патроху) крынічыць усё той жа клопат пра вечнае – пра захаванне чалавечага ў чалавеку і няспраўджаныя ў гэтай сувязі надзеі. Атрымалася, па сутнасці, сатырычна-гумарыстычна-эталагічнае міжжанравае ўтварэнне. Ды яшчэ вытрыманае ў дыялогавай, драматургічнай форме, бо можна паводле яго зместу паставіць міні-спектакль:

Калі ўздымаўся на нагах,
бацькі і ўсе казалі: “Ах!”

Калі ж убіраўся ў сілу зух,
Далі імя другое: “Ух!”

Мінулі гады. Як на смех
Усе яго ўжо звалі: “Эх!”

Цяпер, хто знае на кладах,
Дзе спачывае Эх-Ух-Ах? [2, с. 271]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У апошнім зборніку пераважае разнавіднасць пафасу “камбінаваная”, часам блізкасінтэтычная, узятая “пад крыло” сентыментальна-трагедыйнага настрою. Прыярытэтнасць элегічнага жанру відавочная, бо паэт падводзіць вынікі жыцця, стараецца “Дапісаць эрату / І вены перарваныя / Злучыць” [2, с. 268]. Тут ужо не да адычна-гімнічнай бадзёрасці. Тут справа далікатная, крыку радаснаму не паддаецца. Такім жа элегічна-сумным настроем былі прасякнуты і два папярэдніх зборніка вершаў “Збор калосся” і “Мой каўчэг”. І, калі ісці яшчэ далей, зборнік “За маім сталом” і нават пасляваенны, датаваны 1948 г., са шчымліва-тужлівай назвай, якую даў яму аднайменны верш, – “Каб ведалі”. Але элегія Максіма Танка (фактычна заўсёды!) не слязліва-расчуленая, а “мужная” па інтанацыі, “сурова-строгая” па выказаных пачуццях, прасякнутая не толькі чыста “асабіста-суб’ектыўным”, але і “грамадзянскім” болем. Элегіяй болю, заснаванай на такой высокай маральна-этычнай катэгорыі, як Памяць, можна назваць твор-візітоўку першага пасляваеннага зборніка лірыкі Максіма Танка. У творы падзеі разгортваюцца ў неабсяжнай, бясконцай гарызантальна-вертыкальнай перспектыве, якую можа намаляваць таленавіты мастак-пейзажыст: высокі курган, сасна, якая каранямі да дна апляла дол і вяршыняю кранае зоры. Гэтыя падзеі агучаны (сасна “З ветрам гудзіць, як тугая страла” [3, с. 142], кліча да сябе вятры, каб тыя маглі “іграць залацістым смыком” [3, с. 142]), асыпаны зорным дажджом. Сасна ў творы – дамінантны вобраз-сімвал, які, нібы магніт, прыцягвае да сябе ўсё існае – і вятры, і зоры, і птушак, і – галоўнае – матак, якія страцілі на вайне сыноў-сокалаў (выдатны эпітэт!), запрашае ўсё жывое – яшчэ адзін дамінантны вобраз – у “Родны свой дом” [3, с. 142]. Чытаем твор – і ўяўляем легендарную (Васняцоўскую?) карціну. сасна ў творы – гэта маці ўсяго жывога, ахоўніца Памяці. Сасна – гэта Сумленне, якое не згасае, не павінна згаснуць. Так элегічны настрой “перарастае” рамкі расчаравання і становіцца настроем балючай памяці, а элегія набывае адзнакі баладнага, у дадзеным канкрэтным выпадку, жанру.

Верш арыгінальны па форме. Чаргаваннем доўгіх (канстатуючых) і кароткіх (выніковых) радкоў ён нагадвае Купалаў шэдэўр “А хто там ідзе?”.

Чытаем верш з гэтага ж зборніка – “Добра было б…”, датаваны таксама першым пасляваенным годам. Ён, як і вершы “Каб ведалі”, “Шапэн”, “Камяні”, пафасам сваім нагадвае элегію: сумны настрой; адчуванне невыносных страт сяброў, што не вярнуліся з вайны (“Шмат не прыйшло іх”, “Будзе цяжэй нам без іх пачынаць” [1, с. 51]); самадакаранне, што не змог зберагчы ад куляў сосны, закрыць іх ад ліхіх навальніц сваімі грудзьмі, засланіць далонямі зоры ад пажару вайны; шкадаванне, што засталіся сіротамі дзеці салдат, якія загінулі на вайне. Адным словам – поўны

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

дыскамфорт жыцця, калі ўсё трэба пачынаць з пачатку, непакоіць паэта. Зноў перад намі элегія болю! Аднак спяшацца з канчатковым вывадам не трэба, бо элегічны пафас у вершы перабіваецца адычным, элегічная інтанацыя мяжуецца нават з гімнічнай, бо сцяты ўнутры (душэўны) боль перакрыжоўваецца ў упэўненасцю ў тым, што цяжкасці будуць пераадолены … працай. Верш выкананы ў стылю позняга Максіма Танка: канстатуючыя факты, дэталі пасляваеннага жыцця, як звёны ланцуга, чапляюцца адна за адну, адна адну ўзмацняюць, дапаўняюць, як у эпасе старажытнасці, – і тым самым пашыраюць карціну жыцця да энцыклапедычнай цэласнасці. А ў ролі цэменту, што звязвае кожную дэталь, кожны штрых існасці (прарыўнай у Вечнасць, пазітыўнай!) выступае ў першых трох строфах пачуццё мужнага болю, а ў дзвюх астатніх, заключных, – не менш мужнага гонару, упэўненасці, што бяда, прычыненая вайной, будзе пераадолена, і вокны ў хатах азорацца святлом. Вольнай плынню цячэ аповед, набягаюць адна на адну карціны-хвалі, і ў чытача з'яўляецца вера ў тое, што ўсё згарманізуецца, уладкуецца:

Можа, яшчэ хто з іх прыйдзе дамоў,
Каб паглядзець на прасторы палёў,
Каб паглядзець на багаты ўмалот,
Каб паглядзець на парогі плугоў,
Каб запытаць у сваіх сірот,
Як прытуліў, як прыгрэў іх народ.
Можа яшчэ хто з іх прыйдзе дамоў…

Пэўна, што прыйдзе… За кожным сталом
Месца пакінем для нашых сяброў,
Чарку пакінем з кіпучым віном,
Песню любімую і паначы,
Каб не блудзілі дамоў ідучы,
Вокны ў хатах азорым святлом [1, с. 51].

Элегічная ода, адычная элегія – абодва тэрміна падыходзяць для вызначэння жанравай адметнасці гэтага выдатнага твора. Падобная сітуацыя змешвання прыкмет розных жанраў уласцівая і паэзіі Максіма Танка 60 – 90-х гг. XX ст. "Правальным" жа ў гэтым плане (за рэдкім выключэннем: вершы "На ўзгорку", "Рукі маці", "Жэтон", "Партрэт друга", "Паэзія") было пасляваеннае дзесяцігоддзе. Тады паэт паддаўся кан'юктуры часу панавання тэорыі бесканфліктнасці, вельмі часта абмяжоўваўся замалёўкамі вытворчых і побытавых сцэн ("На дажынках", "Песня трактарыста", "Днём пагожым", "Першыя барозны", "Мінскі трактар", "Агні Мінска", "Ля аэрадрома" і інш.),

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дарожнымі нататкамі (“Ленінград”, “Пражскі дзённік”, “Балатон”, “Будапешт ноччу”, інш.). Падобныя творы можна пашпартызаваць як вершаваныя малюнкі з натуры, нарысы. У гэты час рыторыка, гукапіс нараджалі оду, якая часта складалася з агульных фраз, лозунгаў, і песню. Яркімі ўзорамі такіх (у дадзеным канкрэтным выпадку – сінанімічных – велічальных пафасам) жанраў могуць быць вершы на тэмы дня, пра партыю, Леніна, святочныя даты і г.д.: “Маўзалей”, “Камуністы”, “Застольная”, “У адной калоне”, “На мітынгу”, “Ідуць піянеры”, “Песня будаўнікоў”, “Партыя” і інш. У пацвярджэнне тэзіса пра павярхоўны, неглыбокі падыход да ацэнкі з’яў класіка нашай літаратуры ў перыяд ігнаравання суб’ектыўнага фактару ў творчасці, прыхарошвання рэчаіснасці могуць прывесці наступныя радкі: “Праславім жа ў песні крылатай, / Мае дарагія сябры, / Жыццё – непаўторнае свята – / У майскіх праменнях зары” (“Застольная); “І мы, згуртованыя, ўсе / Ідзём бясконцаю калонай, / І вецер песню ў дальняе / пра сцяг чырвоны” (“На мітынгу”); “Слава сейбіту мудраму, слава, / Роднай партыі слава ў вяках / За яе неўміручыя справы, / За шырокі і сонечны шлях” (“На дажынках”). З песні слова не выкінеш. Была і такая паэзія. І не толькі Танкава, але і панчанкаўская, куляшоўская, броўкаўская. Святочная. Парадная. Кан’юктурная. У жанравых адносінах збедненая і аднабаковая.

Аднак да гонару прадстаўнікоў старэйшага пакалення ў літаратуры, яны змаглі пераадолець ідэалагічны дыктат, узняцца на вышыні самадакарання і самапакаяння, адкрыць чытачам набалелае ў душы, назапашанае ў сэрцы. Вынікам суб’ектывізацыі лірыкі сталася яе тэматычна-пафасная і – адпаведна – жанравая разнастайнасць. Да раней прыведзеных на гэты конт прыкладаў дададзім яшчэ некалькі. У зборніку “Errata” адычны настрой вершаў пасляваеннага дзесяцігоддзя памяняўся на элегічны ці выразна пакаяннем падсвечвацца, як у вершах “Errata”, “Нерукатворнае дзіва”, “Не вязе мне, спадары, прызнацца…”, “Калі адрозніваць мы толькі пачалі…”, “Я веру!”, “Быць ці не быць?”, інш. Той жа самы элегічны настрой спалучаецца з сатырычным і атрымліваецца сатырычная элегія – верш “Цэнтр Еўропы”. З’яўляецца ў апошнім зборніку і памежная жанравая форма (утварэнне) – элегія-эпітафія, да якой можна аднесці верш “Калі адрозніваць мы толькі пачалі…”. Больш таго, у гэтым творы выразны і трагедыйны, баладны пачатак, пра што сведчыць заключны тэзіс твора: “<…> смерць, агледзеўшыся, нас вяртае зноў / Да папялішчаў, кастылёў, крыжоў” [2, с. 289]. Верш “Рэцэнзія” з’яўляецца, па сутнасці, не проста сатырычнай, але саркастычнай рэцэнзіяй (новая жанравая форма!), дыдактычна-павучльным, што грунтуецца на народным вопыце, творам. Паэт выкрывае кан’юктурнае, угодлівае мастацтва, згадваючы пастаноўку ў Берліне оперы “Гарбачоў”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Яшчэ адзін варыянт оды ў зборніку “Errata” – ода біблейская, дыдактычна-павучальная, настаўленне жывым, як жыць па-боску, па-чалавечы. У такой одзе няма агульных лозунгаў, “прахадных” слоў і фраз. Як і ў элегічных творах, у ёй ствараецца шырокая, панарамная карціна жыцця, якое грунтуецца (ці павінна грунтавацца) на агульначалавечых прынцыпах. Характэрным у сувязі з адзначаным творам з’яўляецца Танкаў верш “Я веру!”. Ужо яго назва – не выпадковая: дыстанцыя не такая вялікая паміж “Я веру!” і біблейскім “Я верую”. Сваім стылем, традыцыйным пералічэннем, што прыцягвае, заварожвае ўвагу рэцыпіента, паэт акрэслівае (падкрэслівае) панараму людскіх, боскіх, верніцкіх паводзінаў чалавека: не трэба прымаць нейкія канстытуцыі, праводзіць апытанні, “Каб зямля наша / Стала прыгоднай / Не толькі для мёртвых, / А і для жывых” [2, с. 296], а дастаткова толькі напалам разламаць хлеб з галодным, падзяліцца начлегам з бяздомным, памагчы перайсці вуліцу калеку, падзяліцца песнямі з іншаземцам, раскурыць трубку міру з іншаверцам і, урэшце, “<…> скрыжаваць свае рукі / Не на мячах, а на аралах” [2, с. 296].

Некалі захапіўся і выдатна раскрыў глыбінны пафас оды прыгажосці, жыццю, напісанай класікам нашай літаратуры Максімам Танкам “Ave Maria!” Алег Лойка. У зборніку “Errata” ёсць падобны да яе, аднак больш ідылічны твор – “Карынфская ваза”. Гэта яскравы прыклад міжжанравага ўтварэння – оды-ідыліі, прысвечанай застыглай у стагоддзях, неўміручай прыгажосці і яе магічнаму ўздзеянню на чалавека. Лаканічнае васьмірадкоўе пазбаўлена тропаў, дзеянне ў ім традыцыйна-звычайнае, але ўзведзенае ў ранг вечнага, таму яно і перамагае сваёй гармоніяй малы час:

Карынфская ваза.
Малюнак выразны яшчэ.
Прыўзняўшы хітон саой,
Красуня абутак купляе.
Ад ног яе стройных
Шавец не адводзіць вачэй,
І хоць прамінулі вякі –
Ўсё сандалі да іх прымярае [2, с. 294].

Максім Танк на заключным этапе творчасці (зборнікі “Збор калосся”, “Мой каўчэг”, “Errata”) па-майстэрску карыстаецца і такой жанравай разнавіднасцю, як элегія-просьба. Па-сутнасці, гэта свайго роду элегічнае пасланне, адрасатам якога могуць быць як канкрэтныя людзі, так і грамадства, прырода, радзіма. У “Errata” такім творам з’яўляецца заключны верш – “Даведнік”. Пачатак твора з’яўляецца апісаннем, як заўсёды ў паэта, знаёмства з даведнікам у “жалобнай вокладцы” (слоўнік “Беларускія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пісьменнікі” А.К. Гардзіцкага), які ўразіў апавядальніка прагаламі, – многія мастакі слова загінулі ці на вайне, ці ў высылцы, ці пакончылі з сабой. Другая ж частка – просьба да цёткі Агаты на Радаўніцу паставіць за кошт пенсіі героя верша свечкі на кожную магілку і памаліцца за памерлых. Вывад элегічнага паслання некалькі нечаканы і надзвычай шматзначны:

А тое,
Што ў гэтай святой кнізе
Ёсць і імёны жывых,
Знаць, на недагляду
Прадчасна прыпісана [2, с. 320].

Максім Танк – паэт-наватар, прыхільнік адкрытай павевам новага мадальнай паэтыкі. Яго жанравыя пошукі адпавядаюць пошукам скіраванага ў будучыню мастацтва, свабоднага ад канонаў класічнага рэалізму. Яго пераемнікі – сучасныя маладыя аўтары, якія шукаюць сябе ў сферы мастацкага эксперыменту.

Літаратура

1. Танк, М. Выбранае : вершы / М. Танк ; прадм. В. Зуёнка. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 335 с.
2. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 454 с.
3. Танк, М. Мне пару крыл дала юнацтва… : выбр. лірыка / М. Танк. – Мінск : Маст. літ, 2003. – 479 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ